ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

АРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
3
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 8 (1384)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### АГЛЯД-КОНКУРС

вучэбных груп універсітэта на лепшую пастаноўку фізкультурна-масавай і спартыўнай работы праводзяць камітэт камсамола, прафком, кафедра фізвыхавання і спорту, спартыўны клуб універсітэта.

Вынікі конкурсу будуць падведзены ў канцы навучальнага года.

І. УЛАДЗІМІРАЎ.

### ВЕЧАР ДРУЖБЫ

савецкай і нямецкай моладзі прайшоў нядаўна ў Мінску. На гэты раз у госці да мінчан прыехалі студэнты і аспіранты Ляйпцыгскага універсітэта. У выкананні фальклорнага ансамбля «Неруш» для гасцей прагучалі беларускія народныя песні.

Л. КАМАІШКА,
С. ПЛЫТКЕВІЧ,
студэнты факультэта журналістыкі.

### КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ

па кнізе М. П. Яругіна «О тех, кто выстоял» прайшла на хімічным факультэце. Перад студэнтамі выступіў аўтар.

А. РУКШЫН,
загадчык аддзела абслугоўвання бібліятэкі.

### НА ПАСЯДЖЭННІ

прэзідыума прафкома універсітэта ішла размова аб рабоце прафбюро факультэта журналістыкі па ўмацаванню вучэбнай дысцыпліны.

Старшыня прафбюро юрыдычнага факультэта А. Макрацоў расказаў аб рабоце прафсаюзнай арганізацыі па выхаванню ў студэнтаў беражлівых адносін да сацыялістычнай маёмасці.

Р. МАРЧУК,
кіраўнік прэс-цэнтра прафкома.

### УСЕСАЮЗНЫ ТУРНІР

па класічнай барацьбе памяці чырвоных латышскіх стралкоў прайшоў у Рызе. У ім удзельнічалі каманды, якія рыхтуюцца да Спартакіяды народаў СССР.

У асабістым заліку першае месца, не прайграўшы ніводнага ачка, заняў слухач падрыхтоўчага аддзялення Камандар Маджыдаў.

В. РУДЗЯНКОЎ,
старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.



## 8 САКАВІКА — МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ

Вы — пачатак прыгажосці,
Вы —
Жыцця першапрычына,
Бачым будучыню вашу
У служэнні хараству.
Мы цалуем вашы рукі,
Нашы любыя жанчыны!
Мы схіляем перад вамі
У знак пашаны галаву

## У «ЗАСТЫЛЫМ» ЗААПАРКУ

ТАКОГА ВЯЛІКАГА сіняга матыля памерам з далонь я бачыў упершыню. Каб лепш разгледзець яго, зрабіў крок назад — матыль стаў блакітным. Адышоў убок — фіялетавым.

— «Морфа дзідзеус», — растлумачыў загадчык заалагічнага музея БДУ імя У. І. Леніна Леанід Дзмітрыевіч Бурко, бачачы маё здзіўленне. — Ні адзін фотаздымак, нават каляровы, не дасць поўнага ўяўлення аб ім. Толькі чалавечае вока здольна прасачыць за зіхаценнем колераў, закладзеных прыродай.

З Леанідам Дзмітрыевічам мы ідзём далей. Снежны барс «ірбіс», тыгр, зубр, буры пелікан, баклан — якіх толькі экзатычных жывёлін і птушак не ўбачыш у сценах заалагічнага музея. З густам афармлены музей нагадвае своеасаблівы заапарк, толькі нерухомы, застылы. А яшчэ цэлы жывёльны свет заключаны ў колбах і прабірках!

У музеі паўтары тысячы экспанатаў выстаўлены ў зале і каля чатырох тысяч чучалаў жывёл знаходзіцца ў калекцыйным фондзе. А пачыналася ўсё з невялікай калекцыі пры кафедры заалогіі біялагічнага факультэта. Годам заснавання музея лічыцца 1924, калі прафесар А. В. Фядзюшын прывёз з экспедыцыі на Кольскі паўвостраў багаты збор птушак і марскіх жывёл.

Кожны экспанат з'яўляецца гордасцю музея. «З бухгалтарскага пункту гледжання,— гаворыць старэйшы выкладчык кафедры заалогіі Леанід Паўлавіч Шкляраў, — многія нашы набыткі ацэньваюцца ўсяго ў некалькі рублёў, але з навуковага боку яны неацэнныя».

Некаторыя экспанаты, акрамя навуковай каштоўнасці, маюць і сваю цікавую гісторыю. Чучала бурага мядзведзя, напрыклад. Зробленае рукамі невядомага майстра, яно калісьці ўпрыгожвала палац Радзівіла ў Нясвіжы. З устанаўленнем у Заходняй Беларусі Савецкай улады яго перадалі ва ўласнасць музею. А ў гады акупацыі гітлераўцы паставілі мядзведзя на дах геаграфічнага корпуса і павесілі яму на шыю шыльду «Партызан». Але здзек не ўдаўся — захопнікі дрэнна ведалі заалогію. Пры вонкавай няўклюднасці мядзведзь —звер дужы, спрытны і кемлівы.

Але якімі б цікавымі і каштоўнымі ні былі экспанаты, яны — нішто без людзей, якія іх збіраюць, апрацоўваюць, вывучаюць. Заалагічнаму музею БДУ заўсёды шчасціла на энтузіястаў. Цяперашнія супрацоўнікі з цеплынёй успамінаюць Антона Канстанцінавіча Цітка. Многія гады свайго жыцця гэты чалавек аддаў музею.

Антон Канстанцінавіч працаваў таксідэрмістам, гэта значыць займаўся вырабам чучалаў. Аб складанасці гэтай прафесіі Л. П. Шкляраў сказаў так: «З адной і той жа шкуркі можна зрабіць і прыгожую чайку і растрапаную курыцу. А Цітоκ быў спецыяліст выдатны. Паляўнічы-натураліст, ён добра ведаў жывёльны свет і мог так набіць чучала, што звер нібыта ажываў».

Шчасціць музею і на добраахвотных памочнікаў. Трэцякурснік біяфака Анатоль Харужы прынёс шкурку гагі-грабянушкі. Былы студэнт Юрый Гігіняк пасля экспедыцыі ў Антарктыду падарыў музею тушкі пінгвінаў, чучалы якіх цяпер упрыгожваюць выставачную залу.

Карпатлівая праца супрацоўнікаў атрымала прызнанне нават за межамі краіны. Мядзведжы чэрап з калекцыі Фядзюшына атрымаў залаты медаль на Сусветнай выстаўцы паляўнічых трафеяў у Плоўдзіве.

Ю. БУНЕЕЎ,
студэнт факультэта журналістыкі.

## Вучоба камсамольскага актыву

У БДУ імя У. І. Леніна адбыўся семінар камсамольскіх работнікаў ВНУ горада па ідэйна-палітычнай рабоце.

На семінары былі разгледжаны пытанні арганізацыі і правядзення грамадска-палітычнай атэстацыі, вопыт правядзення ва універсітэце агітпаходу студэнцкай моладзі «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!». Аб рабоце камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна па выхаванню студэнцкай моладзі на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа ўдзельнікам семінара расказалі студэнты і супрацоўнікі універсітэта У. Гафановіч, А. Новік, А. Ліпа, В. Шадурскі. Удзельнікі семінара абмеркавалі таксама праблемы дзейнасці камсамольскіх педатрадаў, азнаёміліся з работай факультэта грамадскіх прафесій універсітэта.

Работай семінара кіраваў загадчык аддзела студэнцкай моладзі Мінскага абкома ЛКСМБ Н. М. Машкароў.

З камсамольскімі работнікамі ВНУ сустрэліся рэктар БДУ імя У. І. Леніна акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі, сакратар парткома універсітэта М. Г. Елісееў, старшыня прафкома М. М. Дрозд.

Удзельнікі семінара наведалі камсамольскія арганізацыі гістарычнага, механіка-матэматычнага факультэтаў, факультэта прыкладной матэматыкі, пабывалі ў музеі універсітэта.

Ю. ВАРАТНІЦКІ,
кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.

# ЖАНЧЫНЫ БІБЛІЯТЭКІ

## ПРАЦУЙЦЕ, СТАНЕ ЦІКАВА

— СТРУКТУРА універсітэцкай бібліятэкі складаецца з 12 аддзелаў, у яе фондзе— 1 млн. 750 тыс. экземпляраў, штогод праводзіцца каля 300 выставак, больш як 120 бібліяграфічных аглядаў, 68 іншых масавых мерапрыемстваў. Аддзел камплектавання кожны год заказвае 65—70 тыс. экземпляраў новай літаратуры, вядзе кнігаабмен з 95 партнёрамі з сацыялістычных краін і са 112 —з Савецкага Саюза.

Прызнаюся, маё паяўленне для Раісы Іванаўны Пустаход, намесніка дырэктара бібліятэкі па навукова-метадычнай рабоце, было нечаканым, але ніякай збянтэжанасці, разгубленасці я не адчула. На маю просьбу расказаць пра бібліятэку адгукнулася ахвотна, і вось— сяджу, слухаю, запісваю... Лічбы, назвы лекцый, дыспутаў, аглядаў, і ўсё гэта без ліхаманкавага капання ў паперках, па памяці, з падрабязнасцямі. Здзіўляюся. Раіса Іванаўна тлумачыць:

— Гэта ж мая праца. Кожны дзень факты гэтыя разоў дзесяць паўторыш, з таварышамі абмяркуеш, а за тыдзень, за месяц колькі? Падлічыце. Усё і зразумееце.

З Раісай Іванаўнай мы размаўляем аб прафесійных якасцях бібліятэкара. У калектыве ім удзяляецца вялікая ўвага, праводзяцца канферэнцыі чытачоў на тэму «Якім быць бібліятэкару?», выступаюць ветэраны, якія працуюць тут ужо больш за трыццаць гадоў. І мерапрыемствы гэтыя — не даніна «галачцы». У паэзіі бібліятэчнай працы больш прозы, таму некаторыя з маладых, раней бачыўшыя толькі паэзію, паступова расчароўваюцца ў абранай спецыяльнасці, губляюць першапачатковы запал, і як вынік — непаразуменне, незадаволенасць чытачоў.

На бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута Раіса Іванаўна трапіла выпадкова, збіралася прысвяціць сваё жыццё спорту, але бацькі адгаворвалі. І калі нехта з сяброўак прапанаваў бібфак, згадзілася, а потым не да спорту стала — захапіла вучоба. Вучыцца даводзіцца і па сённяшні дзень, таму што патрабаванне сучаснасці — быць на ўзроўні эрудзіраванага чытача — Раіса Іванаўна ўспрымае як кіраўніцтва да дзеяння. Так і працуе, без скідак на «суб'ектыўныя абставіны», без патуранняў сабе і іншым. Таму і мае права сказаць: «Цяжка? Працуйце, стане цікава».

## САМАЯ, САМАЯ, САМАЯ...

УСЕ ЖАНЧЫНЫ — НЕПАЎТОРНЫЯ. Не памятаю, у сувязі з чым сказала Зінаіда Дзмітрыеўна гэтую фразу, але калі ўдумацца, сэнс у ёй вялікі. Наогул кожны чалавечы лёс — сама непаўторнасць, і колькі б не пісаў наш брат журналіст: «яе жыццё— гэта жыццё яе пакалення», а ўсё ж...

Пра вайну З. Д. Калеснікава ўспамінаць не любіць. Цяжка гэта ўспамінаць. Ды і што расказаць? Ці ёсць такія словы, якія б дапамаглі адчуць тое, што адчувала сорак два гады назад студэнтка Валагодскага педінстытута? А помніцца ўсё. І спякотны нядзельны дзень. І чарга за квасам. І аб'ява, жахлівей за якую нічога не было. І слёзы старэйшых сясцёр. І пытанні, якія задавала сама сабе: «Як жа гэта? Чаму? За што?»

Гавораць, чалавек да ўсяго прывыкае. Да вайны прывыкнуць нельга.

Яшчэ гавораць, што ў вайны не жаночы твар. Жаночы, калі гэта твар медыцынскай сястры.

Яна прывыкла да тых абставін, у якія паставіла людзей агульнае гора. Не палохалі ўжо патрабавальныя плакаты «Што ты зрабіў для фронту?» Зіна вучылася рабіць уколы, перавязкі, выпісваць рэцэпты. «Радзіма-маці заве!» Усім курсам дзяўчаты падалі заяву ў ваенкамат з просьбай накіраваць іх на фронт. Перад дзяржаўнымі экзаменамі прыйшла павестка...



І пачаліся ваенныя будні. Пад'ём у шэсць гадзін раніцы, адбой у адзінаццаць вечара. Хутка прайшла першая разгубленасць, знікла пачуццё бездапаможнасці. Засталася праца, праца, праца. Адзіная праца. Здавалася, няма ёй канца, як няма канца чалавечым сілам. А калі аднойчы пачулі «сястрычкі» нейкі нястройны гул і ўбачылі зампаліта, які ішоў у акружэнні ўсіх здольных хадзіць раненых, зразумелі — усё. Не было слоў. І слёз таксама не было. Ахапіла нясцерпная стома. Радасць прыйшла потым.

Самая прынцыповая. Самая акуратная. Самая працаздольная. Так гавораць пра Зінаіду Дзмітрыеўну таварышы па рабоце. Некаторыя дадаюць: «Але характар складаны». У чым складанасць? Ва ўменні адстаяць свой пункт гледжання? У пачуцці асабістай адказнасці за любую з даручаных спраў? У нежаданні ісці на самыя нявінныя кампрамісы? Так. І размаўляць тут трэба не пра складанасць характару, а пра цэльнасць натуры, якая загартоўвалася, дарэчы, у гады ваеннага юнацтва.

Працы, якую выконвае Зінаіда Дзмітрыеўна сёння, шмат. Першае і асноўнае — узначальвае кафедральныя бібліятэкі, фонд якіх складае 66 тыс. 400 кніг. Другое — працуе з чытачамі завочнага абанемента. Тут самы час зрабіць невялікае адступленне.

Тварэц і рамеснік. «Што такое творчая праца?», «Ці ўсім быць творцамі?»... Колькі коп'яў тут пераламана, колькі чарніла пераведзена ў ходзе шматлікіх газетных дыскусій! Напэўна, Зінаіда Дзмітрыеўна здзівілася б, калі б пачула, што яна працуе творча. У лепшым выпадку сказала б: «Раблю тое, што лічу патрэбным». Але справа ў тым, што робіць яна значна больш. І ганарыцца гэтым.

— Вось,—успамінае, — аднойчы даслала дыпломніца з філфака пісьмо з просьбай падабраць некалькі кніг. У бібліятэцы філалагічнага факультэта іх не было, у галоўным корпусе я знайшла, але тут, як на бяду, дзяўчына гэтая не запісана. Што рабіць? На свой страх і рызыку ўзяла гэтыя падручнікі на ўласны абанемент і ёй даслала. Не памылілася. Добрая дзяўчына аказалася: і кнігі хутка вярнула, і пісьмо з падзякай напісала.

Гэта толькі адзін эпізод, а колькі іх было! Вось і разважай тут: творчая праца — не творчая. Ніхто б, напэўна, і слова не сказаў, калі б даслала Зінаіда Дзмітрыеўна студэнтцы-завочніцы ветлівы, але адмоўны адказ. Фармальна ўсё было б выканана. Ды ёсць яшчэ і сумленне. І дабрата таксама ёсць. Вось чаму ніхто і ніколі не чуў ад яе: «Я на сваю зарплату ўжо нарабіла». Не ўсё грашыма тымі вымяраецца.

...Трэцяе і апошняе. З. Д. Калеснікава — нязменны старшыня таварыства кнігалюбаў. Пасада клапатлівая, энергіі і сіл патрабуе многа. Але і тут паспявае, спраўляецца.

— Гэта ўсё таму, што яна хадзіць не ўмее, — жартуюць калегі,—толькі бегае. Магчыма, так, але і таму яшчэ, што ў яе на стале пад шклом ляжыць па днях распісаны парадак работы.

— Работа ёсць работа,— згаджаецца Зінаіда Дзмітрыеўна. Але галоўнае для жанчыны — добрыя дзеці. Я ганаруся сваёй дачкой: яна скончыла БДУ ленінскай стыпендыяткай, вучылася ў аспірантуры інстытута арганічнай хіміі імя Зялінскага АН СССР. Нядаўна яе прынялі кандыдатам у члены КПСС. У дзень паспяховай абароны кандыдацкай дысертацыі яна падарыла мне аўтарэферат з такім надпісам:

«Дарагой мамачцы —адзінаму натхніцелю маіх жыццёвых перамог — з глыбокай падзякай і пакланеннем».

Вось у чым шчасце!

## СВЯТАЯ СВЯТЫХ

ЦЯЖКА ЎСТРЫМАЦЦА ад спакусы і не зазірнуць у кнігасховішча — святая святых бібліятэкі. Для дзяўчат, што тут працуюць, нічога дзіўнага няма: кнігі, кнігі, кнігі. Але нашым уразлівым сэрцам чытачоў цяжка стрымаць сябе: «Такое багацце!» Размешчаныя ў строгім парадку, гэтыя скарбніцы чалавечай мудрасці цярпліва чакаюць сваёй чаргі, а табе хоць і вядома, што за свае жыццё чалавек здольны прачытаць толькі 3—3,5 тысячы кніг, але на мінуту здаецца —усе б прачытаў!

Між тым галоўнаму бібліятэкару Ніне Мікалаеўне Мешчараковай і яе калегам — бібліятэкарам Лене Лытко і Надзі Молаш не да эмоцый: другая змена, толькі што атрымалі каля 80 заявак. Зразумела, студэнты ідуць з лекцый і міма бібліятэкі не праходзяць. Наогул люты і сакавік — самы напружаны час для працаўнікоў кнігасховішча: пачынаюцца курсавыя, дыпломныя работы, бібліятэкары штодзённа выдаюць 250—350 кніг. Знаць, і фонд трэба ведаць выдатна, і ў розных галінах сучаснай навукі арыентавацца, каб сумець выбраць тоесную па сэнсу кнігу замест заказанай, але ўжо выдадзенай іншаму чытачу.

Тэрмін выканання заявак —адна гадзіна. Не адзін раз за змену даводзіцца падымацца дзяўчатам са свайго «падзямелля» ў залу навуковай і мастацкай літаратуры. На жаль, няма ў бібліятэцы ніякай механізацыі, але, нягледзячы на цяжкасці (праца ў кнігасховішчы лічыцца адной з самых цяжкіх), і працаваць, і адпачываць яны ўмеюць. Пра гэта з гордасцю гаварыла мне дырэктар бібліятэкі І. У. Арэхоўская.

Ведаеце, што перш за ўсё вызначае сапраўднага кіраўніка? Ён улічвае магчымасці, патрабаванні, характары сваіх супрацоўнікаў, і веданне гэтых тонкасцей дазваляе яму дакладна вызначыць месца і ролю кожнага працаўніка ў агульнай справе. Іменна такі кіраўнік — Ірына Уладзіміраўна. Тактоўны, чулы, патрабавальны. Карацей кажучы, такі, якім і належыць быць кіраўніку бібліятэкі. Але часам яна жартуе: «Усё добрае ў бібліятэцы—ад людзей, усе недахопы — ад дырэктара». Самакрытычны жарт. Ён вырываецца тады, калі не ўсё задуманае здзяйсняецца, не ўсё арганізаванае ўдаецца. Яна не скардзіцца на лёс. Проста разумее — у справе, якую яна абрала, усё проста не будзе, як, дарэчы, ва ўсякай справе, калі адносіцца да яе неабыякава. Разумее і працуе. А калі зусім цяжка даводзіцца, выручае гумар. І людзі. Тыя, што складаюць сёння калектыў бібліятэкі.

...Кажуць, што некалі ў пашане была лічба «7». Сцвярджаюць нават, што яна валодае здольнасцю прыносіць шчасце. Асабіста я аддаю перавагу «васьмёрцы». Але аб густах, як вядома, не спрачаюцца. Тым больш, што ў калектыў бібліятэкі ўваходзіць 87 жанчын, і шчасця з дапамогай той ці іншай лічбы ім не мінуць. Асабліва напярэдадні свята 8 Сакавіка.

**Н. КАЛІШЭВІЧ,**
**наш. кар.**

***

**На здымках:** З. Д. Калеснікава; бібліятэкар А. Лытко, галоўны бібліятэкар Н. Мешчаракова і бібліятэкар Н. Молаш.

**Фота В. ШАЧАКА.**



ВЕЧАР ПРАЦОЎНАЙ СЛАВЫ

# ІМ ПА ДУШЫ НЕСПАКОЙ

*Кожны год у час трэцяга працоўнага семестра ў розныя куткі краіны і рэспублікі накіроўваюцца студэнцкія будаўнічыя атрады універсітэта. Едуць туды, дзе неабходны іх малады запал і гарачыя студэнцкія сэрцы, іх талент і дужыя рукі.*

*У Палацы культуры Мінскага камвольнага камбіната адбыўся вечар працоўнай славы, прысвечаны 20-годдзю СБА Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Прысутныя сустрэліся з ветэранамі будатрадаўскага руху і байцамі СБА-83. Ветэраны расказалі аб сваіх працоўных буднях, першых перамогах і няўдачах, радасцях і хваляваннях...*



1956 ГОД. Кустанайская вобласць. Камышынскі раён. Першае месца дыслакацыі 264 студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна. У той час нават слова такога не было: будатрад. Яно паявілася і трывала ўвайшло ў лексікон студэнтаў пазней. Пазней паявіліся і назвы, традыцыі, ветэраны, вопыт. А пакуль яны былі першымі. І праблем нямала. Вопыту амаль ніякага. «Познали они и любовь и тревогу, побед торжество, неустроенный быт», як пяецца ў песні.

Але не пабаяліся, не адступілі назад. У 1957 годзе—497, а ў 1958—ужо 650 камсамольцаў універсітэта выехалі на ўборку ураджаю. У вольны ад работы час будавалі жылыя дамы, жывёлагадоўчыя памяшканні, майстэрні, гаражы...

Вясной 1963 года пры камітэце камсамола універсітэта быў створаны штаб працоўных спраў, які пачаў камплектаванне і падрыхтоўку студэнцкіх будаўнічых атрадаў да выезду ва Уральскую вобласць.

СБА хутка заваявалі папулярнасць. У 1965 годзе ў БДУ было 8 атрадаў агульнай колькасцю 410 чалавек. Студэнцкі рух хутка набірае сілу. У трэцім працоўным семестры-68 прымала ўдзел ужо 1300 студэнтаў універсітэта, аб'яднаных у 52 атрады. На будаўнічых пляцоўках Беларусі, Казахстана, Эстоніі, Цюменскай і Мурманскай абласцей яны асвоілі 1.347 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, пабудавалі 83 аб'екты.

У пачатку 70-х гадоў становіцца вядомым атрад філалагічнага факультэта «Буравеснік»—першы СБА універсітэта, які заключыў доўгатэрміновы дагавор з прымаючай арганізацыяй. Гэта быў вялікі крок у развіцці будатрадаўскага руху. І ўжо ў працоўным семестры-79 23 атрады працавалі па доўгатэрміновых дагаворах, а з 92 аб'ектаў вытворчага і культурна-бытавога прызначэння 15 былі здадзены ў эксплуатацыю са студэнцкім знакам якасці.





У 70-х гадах пачынаецца летапіс інтэратрадаў. У мінулым годзе інтэрСБА «Арсенал» працаваў у сонечнай Балгарыі, а атрад «Мінск-82» правёў свой трэці працоўны семестр у ГДР. Іх аб'ядноўвала не толькі цікавая і карысная праца, але і сяброўскія сустрэчы, дыскатэкі, вечары дружбы. На іх рабяты расказвалі пра сваю краіну, рэспубліку, пра родны універсітэт.

...За два дзесяцігоддзі студэнцтва пакінула слаўныя працоўныя аўтографы на сонечнай малдаўскай зямлі, у сухіх стэпах Казахстана, сярод суровай сібірскай тайгі і ў гарачым Стаўраполлі, у далёкай Карэліі і на роднай беларускай зямлі.

Усіх памятае летапіс студэнцкага будаўнічага руху БДУ імя У. І. Леніна. Памятае за новы пасёлак і пабудаваныя дамы і школы, за дзіцячыя сады і спартыўныя пляцоўкі. Памятае за вясёлыя і звонкія песні, за канцэрты пад вячэрнім небам на аддаленым палявым стане, за дапамогу ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Яны былі першапраходцамі.

Сёння мы з гонарам называем імёны Васіля Васільевіча Чумакова, Дзмітрыя Мікалаевіча Саковіча, Пятра Іванавіча Брыгадзіна, Веры Акімаўны Прокашавай, Алега Георгіевіча Слукі, Віктара Віктаравіча Жукава і іншых.

Побач з будатрадаўцамі-ветэранамі ў нагу крочаць і маладыя байцы СБА. Мы таксама можам ганарыцца імі. Самых цёплых слоў заслугоўваюць удзельнікі СБА-82 Юрый Варатніцкі і Анатоль Балібардзін, сёстры Вольга і Ганна Бяляк, Тамара Шляхценка і Анатоль Макрацоў, Алена Ліпа і Наталля Шылай і многія іншыя. Гэта яны «строят дорожные ленты в завтрашний день голубой».



У перапынку вечара ваш карэспандэнт сустрэлася з некаторымі з іх і задала некалькі пытанняў.

**ГАННА БЯЛЯК, студэнтка III курса хімічнага факультэта, камандзір СБА «Чырвоныя гваздзікі»:**

**— Ганна, скажы, калі ласка, якім ты бачыш камандзіра СБА? Яго галоўныя рысы?**

— У будатрадзе «Чырвоныя гваздзікі» я два гады. Першы раз ездзіла байцом, а мінулым летам—камандзірам. Вядома, складана было. З першага дня я імкнулася быць не вартаўніком у атрадзе, а звычайным байцом. Удзельнічала ва ўсіх мерапрыемствах, але не вылучала сябе. Будатрад—гэта не кожны сам па сабе, а адзінае цэлае.

І, вядома, прынцыповасць і добразычлівы падыход да людзей.

**НАТАЛЛЯ ШЫЛАЙ, студэнтка V курса механіка-матэматычнага факультэта, камандзір СБА «Стэлуца».**

**— Наташа, чаму вы так назвалі свой атрад?**

— Першае месца дыслакацыі атрада—Малдавія. Адсюль і пайшла назва: малдаўскае «стэлуца» азначае—зорачка.

«Кожны чалавек выбірае на небе для сябе зорку, якая прыдае сілы, калі нам цяжка. Адны выбіраюць яркія, якія адразу ўбачыш у начным небе, другія—амаль непрыкметныя, што спакойна і ласкава выпраменьваюць сваё святло. Наша зорачка ўзышла сем гадоў назад. Яе адметная рыса ў тым, што яна нарадзілася на зямлі. Узышла непрыкметна, і 50 гарачых сэрцаў сталі яе промнямі, каб дарыць святло людзям. Паступова паявілася гісторыя. Год нараджэння — 1976. Месца нараджэння — механіка-матэматычны факультэт БДУ. Месца прапіскі — сонечная Малдавія, Стаўрапольскі край. Прафесія—творца добрых спраў». Гэтыя словы нашага першага камандзіра атрада Галіны Глобус сталі дэвізам «Стэлуцы».

На вечары працоўнай славы выступілі Л. І. Кісялеўскі—рэктар універсітэта, акадэмік АН БССР, М. Г. Елісееў—сакратар парткома, Э. В. Шастаковіч—старшыня прафкома супрацоўнікаў, П. І. Брыгадзін—намеснік сакратара парткома, Г. Я. Рылюк—дацэнт геаграфічнага факультэта, В. А. Прокашава—выкладчыца механіка-матэматычнага факультэта, А. М. Рухля—сакратар камітэта камсамола універсітэта, В. В. Жукаў—камандзір Слабадзейскага зянальнага штаба СБА.

Камандзір рэспубліканскага штаба СБА С. П. Пагарэлаў павіншаваў байцоў зводнага будатрада БДУ імя У. І. Леніна з прысуджэннем яму першага месца сярод СБА рэспублікі і ўручыў Ганаровую грамату ЦК ЛКСМБ, а таксама пераходны Чырвоны сцяг Пскоўскага аблвыканкома, аблсаўпрофа і абкома камсамола.

Зводны СБА універсітэта ўзнагароджаны таксама пераходным Чырвоным сцягам Мінскага абкома партыі, аблвыканкома і абкома камсамола за першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве сярод будатрадаў Мінскай вобласці. Узнагароду ўручылі сакратар Мінскага абкома камсамола В. С. Голуб і камандзір абласнога штаба СБА І. І. Шостак.

Ганаровымі граматамі і каштоўнымі падарункамі ўзнагароджаны камандзіры і камісары будатрадаў — пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва.

**З. АЛЯШКЕВІЧ,**
**наш кар.**



**НА ЗДЫМКАХ: на сцэне — ветэраны СБА і ганаровыя госці вечара; выступае камандзір СБА «Стэлуца» Наталля Шылай; уручэнне Ганаровых грамат і каштоўных падарункаў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва ў працоўным семестры 1982 года; спявае Алена Булыга; нумар мастацкай самадзейнасці выконвае агітбрыгада СБА гістарычнага факультэта.**

Фота **В. Шачака.**

# Знаёмства працягваецца

З ЯКІМ НЕЦЯРПЕННЕМ чакалі студэнты зімовых канікулаў, ведае кожны. Адных клікалі новыя дарогі, другіх — тэатры, выстаўкі, хвалявала прадчуванне знаёмстваў і сустрэч са светам цудоўнага.

З савецкімі студэнтамі зразумела: большасць з іх, асабліва першакурснікі, паехалі дамоў. Хто на Палессе, хто на Віцебшчыну... А як з замежнымі студэнтамі? Пры ўсім жаданні наведаць радзіму, сустрэцца з роднымі і сябрамі за такі кароткі час, вядома, складана. І вось тут на выручку прыйшлі дамы адпачынку, экскурсіі і паездкі па гарадах Савецкага Саюза.

Напрыклад, Лі Амаду, пяцікурснік факультэта журналістыкі, адпачываў у міжнародным маладзёжным цэнтры «Юнацтва». Гэта недалёка, усяго нейкіх 15 кіламетраў ад Мінска, але ўражанняў столькі, што іх хопіць не на адзін дзень.

— Першае, што хочацца сказаць аб маладзёжным комплексе, дык гэта цудоўна арганізаваныя ўмовы правядзення актыўнага адпачынку, — гаворыць Лі.— Разам з савецкімі студэнтамі, якія з'ехаліся сюды з розных куткоў краіны, і прадстаўнікамі студэнцтва замежных краін я быў удзельнікам многіх цікавых мерапрыемстваў. На сустрэчах з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і вядучымі майстрамі савецкага спорту я яшчэ раз адчуў мужнасць савецкага народа і сілу спартыўнага характару. Не менш цікавымі былі дыскатэкі і спартыўныя конкурсы. Дарэчы, у спаборніцтве па шашках я заняў другое месца, — не без гонару гаворыць Лі і паказвае мне сувенір-узнагароду.

Далей студэнт з Гвінеі расказвае пра сваіх новых савецкіх сяброў, пра вечары, праведзеныя ў гарачых спрэчках і захапляючых расказах, а затым паказвае вялікі стос паштовак. На адной з іх я чытаю: «Дарагі Лі! Я вельмі рад, што пазнаёміўся з табой. Спадзяюся, што наша знаёмства не абмяжуецца сустрэчамі ў маладзёжным цэнтры «Юнацтва». Твой сябар Сяргей».

Лі хоча наведаць многія гарады нашай краіны, каб у сябе на Радзіме расказаць аб Краіне Саветаў, яе гісторыі і дні сённяшнім.

Студэнт другога курса Данг Хань у час канікулаў пабываў у Маскве: сустрэўся са сваімі землякамі, што займаюцца на падрыхтоўчым аддзяленні ў МДУ імя М. В. Ламаносава. Разам з імі наведаў Чырвоную плошчу, Маўзалей У. І. Леніна, музей М. І. Кутузава, алімпійскую вёску, ВДНГ.

— Аб ВДНГ я шмат чуў ад сяброў, і маё захапленне яшчэ больш вырасла, калі я пабываў у яе павільёнах. Дзе, як не там, можна ацаніць дасягненні савецкага народа! Новыя сельскагаспадарчыя машыны, станкі, навуковыя прыборы, мадэль касмічнага карабля... Што і казаць, цікава было.

Да нашай размовы далучаецца Ніколас Бардуніас:

— Я наведаў Маскву, Ленінград. І гэта не выпадкова: кожны замежны студэнт па савецкай рэчаіснасці і ўкладу жыцця, па рысах сучасных гарадоў імкнецца зразумець і ацаніць перавагі сацыялізму.

Цёплыя ўспаміны застануцца аб Маскве ў сэрцы Зайнаб Саламы, студэнткі трэцяга курса факультэта журналістыкі, дачкі мужнага палесцінскага народа. Яна ўдзельнічала ў канферэнцыі камітэта савецкіх жанчын, прысвечанай 60-годдзю ўтварэння СССР, расказала аб становішчы палесцінскіх жанчын і дзяцей на акупіраванай тэрыторыі.

Дао Ван Хі, які прыехаў у Мінск з В'етнама і зараз ужо вучыцца на трэцім курсе факультэта журналістыкі, зімовыя канікулы правёў у рускай маці ў Харкаве. Вось што ён расказаў:

— Пасля падрыхтоўчага аддзялення я адпачываў на Украіне. Там пазнаёміўся з савецкай дзяўчынай Таняй. Яе маці аднеслася да мяне як да роднага сына. Зараз Таня выйшла замуж, але я заўсёды прыязджаю ў гэтую сям'ю, нібы дамоў, да сваіх блізкіх. Калі доўга не бываю, маці сварыцца на мяне, але разумее маю занятасць і ніколі не крыўдзіцца.

Здзівіла і прыемна ўразіла тое, што в'етнамскі хлопец называе рускую жанчыну самым дарагім, самым ласкавым словам на зямлі—мама. Відаць, разам з рускай маці Хі знайшоў у нашай краіне другую радзіму.

І гэта радуе.

**С. РАМАНАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



*ГЭТЫЯ здымкі зроблены ў час зімовых канікулаў: студэнты першага курса факультэта журналістыкі ў двухдзённым паходзе на радзіму народнага паэта Беларусі ЯНКІ КУПАЛЫ у Вязынку.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*





# Так мы адпачывалі

МЫ, ЗАМЕЖНЫЯ СТУДЭНТЫ, аспіранты і стажоры, што вучымся ў БДУ імя У. І. Леніна, зімовыя канікулы правялі ў доме адпачынку «Буг». Цікавую і змястоўную праграму падрыхтавалі для нас нашы кіраўнікі—загадчык кафедры рускай мовы па навучанню замежных студэнтаў дацэнт В. В. Равіцкі і выкладчык кафедры Р. Р. Ганчар.

Асабліва ўсхвалявала нас экскурсія ў Брэсцкую крэпасць-герой. Хвілінай маўчання каля Вечнага агню мы ўшанавалі памяць мужных абаронцаў цытадэлі на Бузе.

Вялікую цікавасць выклікалі віктарыны «Ці ведаеце вы рэспубліку, у якой жывяце і вучыцеся?» і «Рускія прыказкі, прымаўкі і крылатыя выразы». Фаціні Панастапулу, Хараклія Цеатакату (Грэцыя), Сэлі Камара (Гвінея), Карлас Фелікс Гансалес, Томес Кардэро Хорхе (Куба) паказалі глыбокія веды па гісторыі Беларусі, яе эканоміцы і культуры, па рускай мове.

Пасяджэнні клуба «Ля карты свету» праходзілі заўсёды ў перапоўненай зале. Сунуну Камара (Гвінея), Рамас Хорхе Эрнэста (Сальвадор) расказалі пра свае краіны, адказалі на шматлікія пытанні. Мы яшчэ раз пераканаліся ў інтэрнацыяналізме савецкіх людзей, у іх добразычлівых адносінах да нас.

Увагу і клопат нашых кіраўнікоў, работнікаў дома адпачынку мы адчувалі пастаянна.

**АРФАН АВАТ АБІД (НДРИ),**
**студэнт факультэта журналістыкі.**



**На здымку:** замежныя студэнты ў Брэсцкай крэпасці.

Фота **аўтара.**

# ВАША СЛОВА, ТАЛЕНТЫ!

АГЛЯД МАСТАЦКАЙ самадзейнасці праводзіцца ў актавай зале БДУ імя У. І. Леніна з 28 сакавіка да 2 красавіка 1983 года. У ім могуць прымаць удзел студэнты дзённай і вячэрняй формы навучання, а таксама прафесарска-выкладчыцкі састаў і супрацоўнікі ў якасці салістаў.

Працягласць выступленняў не больш за 1,5 гадзіны. Факультэту даецца магчымасць правесці адну рэпетыцыю ў актавай зале галоўнага корпуса (не больш за 2 гадзіны). Праграму канцэрта ў 15 экземплярах неабходна падаць у праўленне клуба да 25 сакавіка 1983 года.

Пры падвядзенні вынікаў улічваецца дыяпазон розных жанраў і форм самадзейнай творчасці, прадстаўленых у канцэртнай праграме. Інструментальныя ансамблі выконваюць не больш як тры творы (з улікам выканання з салістамі), харэаграфічныя групы — не больш як тры творы без уліку сольных танцаў, харавыя капэлы — не больш як тры творы, саліст-вакаліст і саліст-інструменталіст выконваюць не больш як два рознажанравыя творы, чытач — не больш як два творы.

Нумары мастацкай самадзейнасці ацэньваюцца па дзесяцібальнай сістэме. У залік ідуць адзнакі за лепшыя 15 нумароў (з улікам выступлення вакальна-інструментальнага ансамбля). Шаснаццатую адзнаку складаюць балы за рашэнне канцэртнай праграмы. Ацэньваючы канцэртную праграму, журы конкурсу ўлічвае: ідэйна-мастацкую якасць праграмы, складанасць рэпертуару, прадстаўленасць жанраў і відаў самадзейнага мастацтва — да 5 балаў, выкананне конкурсных умоў — да 3 балаў, рэжысура і афармленне канцэрта, масавасць удзельнікаў і гледачоў (у адносінах да агульнай колькасці студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта) — да 5 балаў.

Калектыў мастацкай самадзейнасці універсітэта, заняўшы першае месца, узнагароджваецца пераходным сцягам прафкома універсітэта, Ганаровай граматай і грашовай прэміяй рэктарата ў памеры 200 рублёў. Калектывы, заняўшыя другое і трэцяе месцы, узнагароджваюцца Ганаровымі граматамі і грашовымі прэміямі ў памеры адпаведна 150 і 100 рублёў.

Зацверджаны пастаянныя прызы:

— харавому калектыву за выкананне абавязковых твораў (прыз камітэта камсамола)

— лепшаму калектыву за адлюстраванне студэнцкай тэматыкі (прыз прафкома)

— інструментальнаму калектыву за выкананне твораў беларускіх аўтараў (прыз рэктарата)

— за масавасць (прыз прафкома)

— прызамі і дыпломамі ўзнагароджваюцца лепшыя чытачы, салісты-вакалісты.


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
3 сакавіка 1983 г.
Зак. 424. АТ 01104

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ